Установа адукацыі
«Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Начальнік кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права
палкоўнік міліцыі
М.А.Пашкееў
29.08.2025

Рэгістрацыйны № /

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

па вывучэнню вучэбнай дысцыпліны
**«ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ»**

для спецыяльнасці:
6-05-0421-01 Правазнаўства
прафілізацыі Дзяржаўна-прававая дзейнасць

*завочнай формы атрымання адукацыі*

Мінск 2025

***АЎТАР:***
Лапановіч С.Ф., дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права ўстановы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

***РЭЦЭНЗЕНТ:***
Данілаў В.А., дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права ўстановы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

***РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:***
кафедрай тэорыі і гісторыі дзяржавы і права (пратакол № 1 ад 29.08.2025 г.)

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі – гісторыка-прававая навука, якая вывучае працэс змены тыпаў і форм дзяржавы і права, развіцця і змены прававых сістэм на тэрыторыі нашай Айчыны. Прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі ўтвараюць найбольш агульныя заканамернасці ўзнікнення, існавання і развіцця дзяржаўна-прававых з'яў і інстытутаў.

### Роль і месца дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» ўваходзіць у лік фундаментальных гісторыка-юрыдычных дысцыплін агульнаметадалагічнага характару, паколькі ў яе рамках распрацоўваецца праблематыка прадмета і метада юрыдычнай навукі ў цэлым, яе паняційнага апарата, што істотна для фарміравання агульнай прававой культуры юрыста. Важнае значэнне мае гісторыя дзяржавы і права Беларусі і ў працэсе фарміравання грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў, а таксама патрыятычнага выхавання супрацоўнікаў органаў унутраных спраў.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» у рамках тэарэтыка-прававога модуля змяшчаецца ў дзяржаўным кампаненце вучэбных планаў установы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь» па спецыяльнасці 6-05-0421-01 «Правазнаўства».

Ад добрага засваення дысцыпліны залежыць ці будзе будучы юрыст бачыць пераемнасць у развіцці права і дзяржаўных інстытутаў той дзяржавы, грамадзянінам якой з'яўляецца, і ці будзе ён разумець сутнасць публічнага, прыватнага і працэсуальнага права, якое дзейнічае ў Рэспубліцы Беларусь зараз.

### Сувязь з іншымі дысцыплінамі вучэбнага плана

Для авалодання зместам вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі», якая выкладаецца ва ўстанове адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», слухачы і студэнты павінны мець грунтоўную тэарэтычную падрыхтоўку па такіх дысцыплінах, як «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», «Агульная тэорыя права», «Гісторыя дзяржавы і права замежных краін».

Веданне айчыннай гісторыі дзяржавы і права неабходна для паспяховага вывучэння галіновых юрыдычных вучэбных дысцыплін, якое будуецца на грунце разумення праблем эвалюцыйных і рэвалюцыйных зменаў у праве і дзяржаўным будаўніцтве, валодання юрыдычнай тэрміналогіяй.

### Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны

Мэтай вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца выпрацоўка разумення сутнасці гістарычных працэсаў, навыкаў усведамлення галоўных грамадскіх падзей, якія на іх уплывалі, выяўленне важнейшых тэндэнцый і

заканамернасцяў гістарычнага развіцця, асэнсаванне адметнасці эвалюцыі нацыянальнай дзяржаўнасці і бачанне перспектыў яе будучыні. На падставе сістэмнага вывучэння помнікаў права слухачы і студэнты змогуць набыць навыкі аналізу гістарычнага нарматыўнага прававога матэрыялу, што дапаможа ім пры засваенні курсаў галіновых юрыдычных вучэбных дысцыплін вылучаць станоўчыя рысы і добрую вартасць сучаснага заканадаўства, а таксама выяўляць яго недахопы. Такім чынам, усведамленне гісторыі айчыннай прававой сферы мае і практычныя мэты - развіццё ў перспектыве яшчэ больш дасканалага нацыянальнага заканадаўства, найбольш адэкватнага сучаснай прававой свядомасці грамадства.

Задачамі вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца забеспячэнне сістэмнага засваення курса і сфармуляванне дакладных уяўленняў аб храналагічнай паслядоўнасці і этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці, сутнасці важнейшых гістарычных падзей; асаблівасцях у развіцці права і функцыянаванні дзяржаўных органаў улады, судовых устаноў і заканадаўства на важнейшых этапах гістарычнага развіцця; развіццё юрыдычнага мыслення навучэнцаў, у тым ліку - прывіццё навыкаў умелай арыентацыі ў прычынах, гістарычных умовах і асаблівасцях эвалюцыі беларускай дзяржаўнасці. Абавязковым для будучых правазнаўцаў з'яўляецца вывучэнне прававой спадчыны беларускага народа і засваенне катэгарыяльных паняццяў і канцэпцый, распрацаваных гісторыка-прававой навукай, што служыць метадалагічнай базай для паспяховага засваення галіновых і спецыяльных юрыдычных дысцыплін.

**Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу вучэбнай дысцыпліны**

Слухачы і студэнты павінны быць кампетэнтнымі ў наступных відах дзейнасці:

- аналізаваць працэс паслядоўнай змены гістарычных форм дзяржаўных утварэнняў і прававых сістэм на тэрыторыі Беларусі, афармлення і ўмацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;
- на падставе дасягненняў беларускага народа ў развіцці духоўнай і матэрыяльнай культуры ведаць ідэалагічныя, маральныя каштоўнасці грамадства і дзяржавы і ўмець прытрымлівацца ім;
- разумець месца і ролю беларускіх зямель у геапалітычных працэсах у розныя гістарычныя перыяды, характарызаваць ўклад беларускага народа ў перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне;
- аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах еўрапейскай інтэграцыі і сусветнай глабалізацыі;
- выкарыстоўваць гісторыка-культурную спадчыну Беларусі ў сваёй дзейнасці;
- валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму.

Вывучэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі прадугледжвае пэўную логіку арганізацыі працэсу пазнання: успрыняцце вучэбнага матэрыялу і

ўсведамленне адукацыйных задач; асэнсаванне вывучаемага матэрыялу з разуменнем яго ўнутраных сувязей і адносін; засваенне вучэбнага матэрыялу; прымяненне атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў у практычнай дзейнасці, што павінна ўлічвацца пры планаванні лекцый, семінарскіх заняткаў і арганізацыі самастойнай працы навучэнцаў.

**Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з навучальным планам УВА па спецыяльнасці**

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі – 5 гадоў: агульная колькасць гадзін – 198, колькасць аўдыторных гадзін – 20, з якіх 12 гадзін – лекцыі, 8 гадзін – семінарскія заняткі.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі – 3 гады: агульная колькасць гадзін – 198, колькасць аўдыторных гадзін – 20, з якіх 12 гадзін – лекцыі, 8 гадзін – семінарскія заняткі.

**Размеркаванне вучэбнага часу па відах заняткаў**

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі 5 гадоў – размеркаванне агульнага і аўдыторнага часу па сяместрах і відах заняткаў складае:

2 семестр агульная колькасць гадзін – 100, колькасць аўдыторных гадзін – 14; з якіх 12 гадзін – лекцыі; 2 гадзіны – семінарскія заняткі;

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – апытанне (у вуснай ці пісьмовай форме), або тэсціраванне па тэме тэме 7 (на выбар выкладчыка).

3 семестр агульная колькасць гадзін – 98, колькасць аўдыторных гадзін – 6, з якіх 6 гадзін – семінарскія заняткі.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – апытанне (у вуснай ці пісьмовай форме), або тэсціраванне па тэме тэме 9 (на выбар выкладчыка).

Форма прамежкавай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – экзамен у 3 семестры, колькасць заліковых адзінак – 6.

Тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі 3 гады – размеркаванне агульнага і аўдыторнага часу па сяместрах і відах заняткаў складае:

1 семестр: агульная колькасць гадзін – 198, колькасць аўдыторных гадзін – 20, з якіх 12 гадзін – лекцыі, 8 гадзін – семінарскія заняткі.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – апытанне (у вуснай ці пісьмовай форме), або тэсціраванне па тэме тэме 9 (на выбар выкладчыка).

Форма прамежкавай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – экзамен у 1 семестры, колькасць заліковых адзінак – 6..

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» прадстаўлена на аснове традыцыйнага падыхода з разбіццём зместу на 11 тэм. Змест кожнай тэмы адлюстроўвае сучасны ўзровень і тэндэнцыі развіцця навуковых гісторыка-прававых ведаў.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЛЕКЦЫЙ

**Рэкамендацыі па папярэдняй падрыхтоўцы да лекцыі**

На лекцыях слухачы і студэнты знаёмяцца з асноўнымі навукова-тэарэтычнымі і канкрэтна-гістарычнымі палажэннямі дысцыпліны (якія абгрунтоўваюцца лектарам адпаведнымі фактамі і прыкладамі); праблемнымі пытаннямі тэм, а таксама атрымліваюць рэкамендацыі лектара па самастойнай працы над вучэбным матэрыялам.

Для таго, каб успрымаць тэкст лекцыі, рэкамендуецца папярэдне азнаёміцца з тэкстам асноўных вучэбных дапаможнікаў па пэўнай тэме. Пры вывучэнні пэўных тэм дысцыпліны слухачам і студэнтам таксама рэкамендуецца папярэдне азнаёміцца і асэнсаваць наступныя асноўныя паняцці і тэрміны:

**Тэма 1. Прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі і яго асаблівасці. Гістарыяграфія, перыядызацыя**

Метад, перыядызацыя, гістарыяграфія, гістарычная крыніца.

**Тэма 2. Дзяржаўнасць і права ўсходніх славян ранняга сярэднявечча (IX – першая палова XIII ст.). Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях**

Канцэпцыя, дзяржаўна-палітычны лад, грамадскі лад, крыніцы права, звычаёвае права.

**Тэма 3. Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII ст. – першай палове XVI ст. Грамадскі і дзяржаўны лад, прававая сістэма**

Гаспадар, Рада, Сойм, структура феадальнага грамадства, прававая сістэма.

**Тэма 4. Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – канец XVIII ст.). Асаблівасці грамадскага, дзяржаўнага ладу і права**

Рэч Паспалітая, Сенат, Пасольская ізба, Галоўны Трыбунал ВКЛ, Статут.

**Тэма 5. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.). Асаблівасці грамадскага, дзяржаўнага ладу і права**

Імперыя, губерня, Звод мясцовых законаў, буржуазныя рэформы, Дзяржаўная Дума.

**Тэма 6. Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў перыяд рэвалюцыйных пераўтварэнняў і ўтварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусіі (1917-1922 гг.)**

Рэвалюцыя, Першы Ўсебеларускі з’езд, Аблвыканкамзах, Устаўная грамата, ССРБ.

**Тэма 8. Заходнебеларускія землі ў складзе Польскай Рэспублікі. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР (1921–1941 гг.)**

Рыжская мірная дамова, ІІ Рэч Паспалітая, Заходняя Беларусь, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

**Рэкамендацыі непасрэдна па складанні канспекта лекцый**

Шматлікія крыніцы вучэбнай і навуковай інфармацыі, з якімі сутыкаюцца слухачы і студэнты пры вывучэнні дысцыпліны патрабуюць сістэматызацыі. Лектар сістэматызуе інфармацыю, зыходзячы як з прынцыпа метадалагічнай дакладнасці, так і з досведу гісторыі развіцця гісторыка-прававой навукі. Акрамя таго, лектар павінен даваць тлумачэнні слухачам і студэнтам па пэўных светапоглядных і метадалагічных пазіцыях навукоўцаў, выкладзеных у літаратуры, а таксама па тэрміналагічных разыходжаннях у вучэбнай і навуковай літаратуры.

Найбольш распаўсюджанай формай сістэматызацыі інфармацыі, якую слухачы і студэнты атрымліваюць на лекцыі, застаецца састаўленне канспектаў – кароткіх пісьмовых (ці набраных у тэкставым рэдактары пры выкарыстанні ноутбука) пераказаў яе зместу.

Канспектаванне лекцыі развівае лагічнае мысленне слухачоў і студэнтаў, садзейнічае ўдасканаленню моўнай культуры, замацоўвае ў памяці прачытанае і пачутае. Разам з тым, вядзенне канспекта – досыць цяжкі занятак, паколькі адначасова слухаць лектара, асэнсоўваць прамоўленае ім і хутка запісваць галоўнае атрымліваецца далёка не ва ўсіх навучэнцаў. Калі лекцыя чытаецца ў дастаткова хуткім тэмпе, а лектар з розных прычын не мае магчымасці выкласці ў свабодны для навучэнцаў доступ яе тэкст, узнікае неабходнасць ў засваенні пэўнай тэхнікі вядзення канспекта, некаторыя з іх апісаны ў наступнай літаратуры :

Канспект лекцыі пры рэпрадуктыўным ці аналітычным (творчым) канспектаванні можа мець розныя формы, напрыклад:

- цытатніка – даслоўнай перадачы часткі лекцыі. Цытаваць рэкамендуецца для дакладнай перадачы тэксту артыкула нарматыўнага акта, думкі навукоўца, якога цытуе лектар, ці думкі самаго лектара, што неабходна для наступных спасылак на першакрыніцу ці аўтарскі тэкст, а таксама для ілюстрацыі стылю мыслення лектара;
- плана-тэзісаў – паслядоўнага пераліку асноўных палажэнняў лекцыі і кароткага пераказу асноўных думак, якія былі выказаны лектарам ;
- анатацыі – найбольш кароткай формы выкладання асноўнага зместу

лекцыі;
- рэферата – кароткага апісання тэксту лекцыі з наборам ключавых слоў і асноўных палажэнняў;
- апорнага канспекта – выкладання тэкста пасродкам схем, малюнкаў, слоў-дэскрыптараў. Апорны канспект служыць у асноўным для стварэння спрыяльных умоў у працэсе запамінання інфармацыі, а не для яе аналіза.

Асноўнымі прыёмамі пры канспектаванні лекцыі з’яўляюцца :
- скарачэнні слоў, словазлучэнняў, тэрмінаў.
- перапрацоўка фразы;
- выкарыстанне колеру.

На апошнім аркушы канспекта рэкамендуецца мець табліцу (слоўнік) скарачэнняў і знакаў, как не забываць іх сэнс.

Рэкамендуецца таксама ў час канспектавання лекцыі пакідаць палі, ці пісаць на адной старонцы аркуша, што дазволіць значна папоўніць канспект у час самастойнай працы з крыніцамі і манаграфічнай літаратурай перад семінарамі і напярэдадні экзамена.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

Засваенне вучэбнага курса «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» прадугледжвае сістэматычную і інтэнсіўную самастойную працу слухачоў і студэнтаў пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Слова «семінар» паходзіць ад лацінскага *«seminarium»* – «рассаднік», «крыніца». У нашы дні пад семінарам разумеецца асобая форма групавых заняткаў у вышэйшых навучальных установах па пэўнай вучэбнай дысцыпліне, асноўнай характарыстыкай якой з’яўляецца абмеркаванне праблемных пытанняў курса пры актыўнасці ўсіх удзельнікаў. На семінарскіх занятках іх ўдзельнікі павінны імкнуцца да найбольш глыбокага спасціжэння сутнасці абмяркоўваемай тэмы і яе праблематызацыі. Канчатковая мэта семінарскіх заняткаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі – пры наладжанай камунікацыі дасягнуць узнікнення рэфлексіі і ўрэшце – канцэптуальнага гісторыка-прававога мыслення.

Добрасумленная падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў – аснова трывалага авалодання ведамі па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Семінары даюць магчымасць слухачам і студэнтам супаставіць і верыфікаваць свае веды, сцвердзіцца ў сваім светапоглядзе.

Менавіта на семінары выпрацоўваюцца ўменні самастойна пераапрацоўваць атрыманую на лекцыях і пры самастойнай працы інфармацыю, фармуляваць правілы дыскусіі, лагічна будаваць сістэмы доказаў і рабіць вывады, даваць ацэнкі. Тут набываюцца навыкі публічнага выступлення перад аўдыторыяй, вядзення дыспуту, паводзінаў у навуковай спрэчцы.

**Алгарытм працы** на семінарскіх занятках вызначаецца выкладчыкам, які праводзіць іх у канкрэтнай вучэбнай групе і прымае экзамен па дысцыпліне. Агульныя патрабаванні да арганізацыі кіруемай самастойнай работы курсантаў вызначаюцца Палажэннямі і метадычнымі рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Вучэбныя пытанні** для вывучэння і абмеркавання на семінарскіх занятках выкладзены ў вучэбна-метадычнай карце дысцыпліны. Планы семінарскіх заняткаў складзены такім чынам, каб даць слухачам і студэнтам магчымасць выявіць свае веды па найбольш складаных тэмах вучэбнага курса.

**Непасрэдную падрыхтоўку** да семінарскіх заняткаў трэба пачынаць з працы над вучэбным і лекцыйным матэрыялам па дадзенай тэме – адпаведнымі раздзеламі вучэбных дапаможнікаў і канспектам лекцыі. Пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў рэкамендавана азнаямленне і, па магчымасці, вывучэнне асобных навуковых артыкулаў, манаграфій і калектыўных твораў, прысвечаных праблематыцы тэмы, а таксама праца з першакрыніцамі – помнікамі права: нарматыўнымі дагаворамі, судзебнікамі, ста¬тутамі і г.д. Вялікая ўвага пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў павінна быць удзелена нарматыўным актам і дагаворам (прававым помнікам).

**Пры аналізе** прававога помніка (прывілея, судзебніка, статута, канстытуцыі і г.д.) перш за ўсё неабходна высветліць і засвоіць:

- канкрэтна-гістарычныя ўмовы і абставіны з’яўлення дакумента, а таксама яго «гісторыю» (слухачы і студэнты пры гэтым павінны ведаць прычыны, якія выклікалі неабходнасць распрацоўкі і прыняцця вывучаемага дакумента; гістарычныя падзеі, у якіх ён узнік; крыніцы акта ці дагавора, які вывучаецца; распрацоўшчыкаў акта; дзяржаўна-палітычныя або іншыя мэты, якія ставілі перад сабой тыя, хто распрацоўваў і ўхваляў вывучаемы акт; час, калі акт быў выдадзены і калі ён спыніў сваё дзеянне, і г.д.);
- асноўныя палажэнні дакумента;
- значэнне вывучаемага прававога помніка.

Слухачы і студэнты павінны таксама засвоіць асноўныя гісторыка-юрыдычныя тэрміны, якія ўжываюцца ў вывучаемым дакуменце. Работа з помнікамі права ў значнай ступені ўскладняецца тым, што слухачы і студэнты пры вывучэнні дысцыпліны сутыкаюцца з тэкстамі на старабеларускай і польскай мовах, трапляецца ў дакументах і значная колькасць лацінскіх тэрмінаў. Таму звычайна існуюць пэўныя цяжкасці ў разуменні тых ці іншых гісторыка-прававых паняццяў. У гэтай сітуацыі трэба карыстацца даведачнай літаратурай (у тім ліку такімі выданнямі як: «Гістарычны слоўнік беларускай мовы», «Старабеларускі лексікон», «Латинско-русский словарь» і інш.) ці пракансультавацца з выкладчыкам.

Для падрыхтоўкі грунтоўных і правільных адказаў навучэнцам рэкамендавана карыстацца – ў якасці ўзору – наступнымі **прафесійна-тэматычнымі блокамі;**

**РАЗВІЦЦЁ ДЗЯРЖАВЫ.**

1. Прычыны ўзнікнення (эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя і інш.).
2. Час ўзнікнення, этапы станаўлення дзяржаўнасці.
3. Прычыны і час скону (распаду, заваёвы і інш.).

**ГРАМАДСКІ ЛАД.**

1. Кароткая характарыстыка эканамічнай сістэмы.
2. Класы, станы, страты і іншыя сацыяльныя групы грамадства.
3. Эканамічны і прававы статус розных сацыяльных груп насельніцтва.

**ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД.**

1. Форма дзяржаўнага ўладкавання.
2. Форма праўлення (кіравання).
3. Палітычны рэжым.
4. Дзяржаўны апарат (сістэма дзяржаўных органаў, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці, парадак камплектавання, іх кампетэнцыя і юрысдыкцыя).

**РЭВАЛЮЦЫЯ.**

1. Прычыны рэвалюцыі (эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя і інш.).
2. Рэвалюцыйная сітуацыя.
3. Час, этапы, рухаючыя і кіруючыя сілы.
4. Нарматыўныя акты, прынятыя ў час рэвалюцыі, якія замацавалі яе вынікі.
5. Значэнне рэвалюцыі.

**ДЗЯРЖАЎНЫ ОРГАН.**

1. Прычыны і час стварэння.
2. Парадак камплектавання.
3. Састаў (склад) органа (колькасны, сацыяльны (класавы, саслоўны і інш.), партыйны і інш.).
4. Структурныя элементы органа.
5. Кампетэнцыя органа.
6. Узаемаадносіны з іншымі дзяржаўнымі органамі.
7. Значэнне органа ў справе замацавання дзяржаўнай улады.

**ПОМНІК ПРАВА.**

1. Прычыны ўзнікнення.
2. Гісторыя распрацоўкі.
3. Крыніцы.

4. Структура.
5. Змест.
6. Значэнне.

Прымаючы да ўвагі профіль вышэйшай навучальнай установы, слухачы і студэнты павінны дбайна вывучыць матэрыял аб крымінальным вышуку, следстве, паліцыі (міліцыі), установах выканання пакаранняў і г. д.

Пры падрыхтоўцы да заняткаў і экзамена слухачам і студэнтам рэкамендуецца таксама памятаць пра прафесійныя тэматычныя блокі, што дапаможа адабраць з рэкамендаванай літаратуры прафесійна значымы матэрыял, і весці канспект па найбольш складаных для засваення тэмах вучэбнага курса.

Такі конспект неабходны для таго, каб: «навучыцца перапрацоўваць любую інфармацыю, надаваць ёй іншы выгляд, тып, форму; вылучыць у тэксце самае неабходнае і патрэбнае для вырашэння вучэбнай ці навуковай задачы; стварыць паняційную ці структурную мадэль праблемы; спрасціць запамінанне тэксту; палегчыць працэс авалодання спецыяльнымі тэрмінамі ; накапіць інфармацыю для напісання пісьмовай работы ў выглядзе паведамлення, рэферата, ці навуковай працы».

Паспяховасць складання канспекта першакрыніцы ці манаграфіі залежыць ад умення структурыраваць матэрыял. «Неабходна не толькі навучыцца вылучаць асноўныя паняцці, але і намацоўваць сувязі паміж імі. Пры працы з пісьмовым тэкстам трэба памятаць, што ён складаецца з абзацаў, якія служаць для таго, каб палегчыць зрокавае ўспрыняцце тэксту, і абазначыць пачатак новай думкі, новага палажэння. Вельмі важна навучыцца выяўляць галоўную думку, заключаную у абзац, уласнымі словамі, захоўваючы пры гэтым логіку выкладання тэксту аўтарам».

Калі выбаркавае канспектаванне будуецца на пошукавым і праглядавым прачытанні тэксту («па дыяганалі»), то скразное канспектаванне робіцца пры поўным прачытанні пэўнай крыніцы ці артыкула. Як выбаркавае, так і скразное канспектаванне можы быць як рэпрадуктыўным, так і творчым.

Выбар формы канспектавання залежыць ад мэты работы над тэкстам і яго асаблівасцей. Пры канспектаванні кнігі, раздзела калектыўнай манаграфіі, артыкула, неабходна ўказаць імя і прозвішча аўтара, яго месца працы, назву навуковага твора, месца і год выдання, назву выдавецтва, старонкі і іншую значную інфармацыю.

Вучэбная праграма па дысцыпліне ў якасці адной з формаў кантролю ведаў прапануе **падрыхтоўку паведамленняў і дакладаў**. Паведамленні рэкамендуецца рыхтаваць у вуснай форме, магчыма выкарыстанне апорнага канспекту асноўных палажэнняў і дакументаў. Даклад рэкамендуецца падрыхтаваць у пісьмовай форме.

Даклад – гэта самастойная работа навучэнца, якая ўяўляе сабой

кароткае даследванне і абагульненне (у пісьмовым выглядзе) розных ідэй, канцэпцый і пунктаў гледжання на аснове самастойнага аналізу розных крыніц. Даклад павінен змяшчаць матэрыял, сабраны навучэнцам са спецыяльнай літаратуры, самастойна скампіляваны і выкладзены ў адпаведнасці з абранай тэмай і рэкамендацыямі выкладчыка, а таксама высновы, самастойна зробленыя навучэнцам з разгляду дадзенага матэрыялу.

Структура даклада ўключае наступныя часткі: тытульны аркуш; увядзенне; асноўная частка; заключэнне; спіс выкарыстаных крыніц. Тэмы паведамленняў і дакладаў змешчаны ва вучэбна-метадычным дапаможніку: "Лапановіч, С. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў установ вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-24 01 02 «Правазнаўства», 1-24 01 03 «Эканамічнае права» / Лапановіч, С.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэбна-метадычны дапаможнік / С.Ф. Лапановіч ; Акад . М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь. – 2-е выд., дап. і перапр. – Мінск : Акадэмія МУС, 2025. – 300, [2] с" у раздзеле "Прыкладныя тэмы рэфератаў".

**Алгарытм разгляду пытанняў на семінарскіх занятках**
**(тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі 5 гадоў)**

**2 семестр**

**Тэма 7. “Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (1922–1939 гг.)”**

*2 (гадзіны)*

1. Уваходжанне БССР у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.
2. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у перыяд НЭП і беларусізацыі ў 20-я гады ХХ ст.
3. Станаўленне адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў БССР. Грамадскі і дзяржаўны лад БССР у 30-я гады ХХ ст.
4. Судовая сістэма БССР і пазасудовыя рэпрэсіўныя органы..

**3 семестр**

**Тэма 9. “Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пад час Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.)”**

*2 (гадзіны)*

1. Палітыка генацыда нацысцкага рэжыму на акупаванай тэрыторыі Беларусі.
2. Станаўленне і развіццё партызанскага руха на Беларусі ў 1941 – 1942 гг. Стварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху і Беларускага штаба партызанскага руху.
3. Асноўныя напрамкі баявой дзейнасці беларускіх партызан у 1943 – 1944 гг. «Рэйкавая вайна».
4. Антыфашысцкае падполле ў Беларусі: формы і метады барацьбы.

**Тэма 10. “Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у другой палове 40-х – пачатку 90-х гадоў ХХ ст.”**

*2 (гадзіны)*

1. Савецкі дзяржаўны і грамадскі лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 50-х гг. ХХ ст.
2. ХХ з’езд КПСС 1956 г. Савецкі дзяржаўны і грамадскі лад БССР у другой палове 50-х – сярэдзіне 60-х гг. ХХ ст. Утварэнне саўнаргаса БССР.
3. Савецкі дзяржаўны і грамадскі лад БССР у другой палове 60-х – сярэдзіне 80-х гг. ХХ ст.
4. Міжнародная дзейнасць БССР. БССР – краіна-заснавальніца Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

**Тэма 11. “Дзяржаўнасць і права сувярэннай Рэспублікі Беларусь (1991 – пачатак ХХІ ст.)”**

*2 (гадзіны)*

1. Канстытуцыйнае будаўніцтва ў Беларусі. Рэферэндумы Рэспублікі Беларусь 1995, 1996, 2004, 2022 гг.
2. Дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
3. 3.Фарміраванне прававой сістэмы. Кадыфікацыя заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
4. Міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь. Саюз Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

**Алгарытм разгляду пытанняў на семінарскіх занятках (тэрмін атрымання вышэйшай адукацыі 3 гады)**

**1 семестр**

**Тэма 7. “Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (1922–1939 гг.)”**

*2 (гадзіны)*

1. Уваходжанне БССР у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.
2. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у перыяд НЭП і беларусізацыі ў 20-я гады ХХ ст.
3. Станаўленне адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў БССР. Грамадскі і дзяржаўны лад БССР у 30-я гады ХХ ст.
4. Судовая сістэма БССР і пазасудовыя рэпрэсіўныя органы..

**Тэма 9. “Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пад час Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.)”**

*2 (гадзіны)*

1. Палітыка генацыда нацысцкага рэжыму на акупаванай тэрыторыі Беларусі.
2. Станаўленне і развіццё партызанскага руха на Беларусі ў 1941 – 1942 гг. Стварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху і Беларускага штаба партызанскага руху.
3. Асноўныя напрамкі баявой дзейнасці беларускіх партызан у 1943 – 1944 гг. «Рэйкавая вайна».
4. Антыфашысцкае падполле ў Беларусі: формы і метады барацьбы.

**Тэма 10. “Дзяржаўнасць і права Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублік у другой палове 40-х – пачатку 90-х гадоў ХХ ст.”**

*2 (гадзіны)*

1. Савецкі дзяржаўны і грамадскі лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 50-х гг. ХХ ст.
2. ХХ з’езд КПСС 1956 г. Савецкі дзяржаўны і грамадскі лад БССР у другой палове 50-х – сярэдзіне 60-х гг. ХХ ст. Утварэнне саўнаргаса БССР.

3. Савецкі дзяржаўны і грамадскі лад БССР у другой палове 60-х – сярэдзіне 80-х гг. ХХ ст.
4. Міжнародная дзейнасць БССР. БССР – краіна-заснавальніца Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

**Тэма 11. “Дзяржаўнасць і права сувярэннай Рэспублікі Беларусь (1991 – пачатак XXI ст.)”**

*2 (гадзіны)*

1. Канстытуцыйнае будаўніцтва ў Беларусі. Рэферэндумы Рэспублікі Беларусь 1995, 1996, 2004, 2022 гг.
2. Дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
3. Фарміраванне прававой сістэмы. Кадыфікацыя заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
4. Міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь. Саюз Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

**Пытанні для самастойнага вывучэння з выкарыстаннем крыніц з спісу асноўнай і дадатковай літаратуры.**

**Тэма 2. Грамадска-палітычны лад і права першых дзяржаўных ўтварэнняў на беларускіх землях (IX – першая палова XIII ст.).**

1. Старажытнае насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі.
2. Канцэпцыі паходжання дзяржаўнасці.
3. Месца беларускіх зямель у складзе Старажытнарускай дзяржавы – Русь.
4. Фарміраванне класаў і сацыяльных груп насельніцтва.
5. Сістэма органаў улады і кіравання. Князь і княжацкая ўлада. Службовыя асобы. Веча.
6. Суд і судаводства.
7. Хрысціянізація насельніцтва. Дзяржава і царква.
8. Старажытнае права на беларускіх землях. Крыніцы права ў IX– XIII стст. Звычаёвае права: сутнасць, асноўныя рысы.
9. Першыя пісаныя помнікі права: Руская Праўда, княжацкія статуты, міждзяржаўныя дагаворы (з Візантыяй ў X ст., дагавор 1229 г. з Рыгай і Гоцкім берагам і інш.).
10. Кананічнае права. Рэцэпцыя візантыйскага царкоўнага права. «Кормчая кніга».

**Тэма 3. Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII ст. - першай палове XVI ст. Грамадскі і дзяржаўны лад, прававая сістэма**

1. Асноўныя канцэпцыі паходжання Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.
2. Знешнія і ўнутраныя, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы працэсу ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.
3. Працэс фарміравання тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, яго адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ў другой палове XIII– першай палове XVI стст. Васальная залежнасць мясцовых (удзельных) князёў ад вялікага князя.
4. Структура феадальнага грамадства. Падзел на класы і саслоўі. Фарміраванне саслоўя шляхты. Прававы статус шляхты.
5. Правы статус духавенства (праваслаўнага, рыма-каталіцкага і пратэстанцкага і інш.).
6. Сацыяльнае і прававое становішча розных катэгорый сялян. Працэс запрыгоньвання сялян і яго адлюстраванне ў заканадаўстве.
7. Гарадское насельніцтва і яго структурны падзел. Афармлснне прававога становішча гараджан (месцічаў). Правы і абавязкі гараджан

вялікакняжацкіх (дзяржаўных) гарадоў і прыватнаўласніцкіх гарадоў. Статус гараджан у гарадах з магдэбургскім правам.

8. Утварэнне цэхаў і брацтваў. Барацьба гараджан за сацыяльныя і палітычныя правы.
9. Сістэма органаў дзяржаўнай улады. Прававое становішча вялікага князя (гаспадара) дзяржавы. Рада Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Яе склад і кампетэнцыя. Змены ў прававым становішчы рады ў XV -XVI стст.
10. Вышэйшыя службовыя асобы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (земскія і дворныя): маршалак земскі, канцлер, гетман земскі, падскарбі земскі і іншыя службовыя асобы дзяржавы. Іх прававое становішча і дзейнасць.
11. Сойм Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Працэс станаўлення, склад і парадак дзейнасці. Кампегэішыя сойма. Заканадаўчая дзейнасць сойма.
12. Мясцовыя органы дзяржаўнай улады ў перыяд цэнтралізацыі дзяржавы. Службовыя асобы мясцовай адміністрацыі. Ваяводы. Старасты. Дзяржаўцы. Павятовыя маршалкі. Харужыя. Старцы. Соцкія. Іншыя службовыя асобы.
13. Органы ўлады і кіравання ў гарадах. Станаўленне самакіравання ў гарадах з магдэбургскім правам. Прававое становішча войта. Гарадская рада. Бурмістры. Статус лаўнікаў.
14. Судовая сістэма і судаводства Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIII – першай палове XVI стст.
15. Вышэйшыя судовыя органы дзяржавы. Гаспадарскі (вялікакняжацкі, задворны) суд. Маршалкоўскі суд. Камісарскі суд. Канцлерскі суд. Суд падскарбія земскага. Гетманскі суд. Суд паноў-рады.
16. Склад і юрысдыкцыя мясцовых судоў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (замкавага, земскага і інш.) да судовай рэформы сярэдзіны XVI ст. Вотчынны суд. Палюбоўны суд. Трацейскі суд. Копны суд, склад і юрысдыкцыя.
17. Войтаўска-лаўніцкі суд (суд лентвойта і суд войта) і бурмісцерска-радзецкі суд ў гарадах, якія атрымалі прывілеі на магдэбургскае права. Парадак іх фарміравання і дзейнасці, юрысдыкцыя. Апеляцыйны (асэсарскі) суд для гарадоў на магдэбургскім праве.
18. Вышэйшыя (цэнтральныя) суды дзяржавы. Гаспадарскі (Вялікакняжацкі) суд, яго склад, кампетэнцыя і парадак дзейнасці. Суд паноў-рады. Камісарскі суд. Соймавы суд. Падсуднасць спраў.
19. Мясцовыя суды: замкавы (гродскі), земскі, падкаморскі, каптуровы, копны, войтаўска-лаўніцкі. Перыяд утварэння, склад, парадак фарміравання і дзейнасці. Падсуднасць спраў. Сялянскія суды. Вотчынны суд феадала над залежнымі людзьмі. Судова-працэсуальнае права.
20. Сістэмнае рэфармаванне дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў 50 – 60-х гг. XVI ст. (аграрная, адміністрацыйна-

тэрытарыяльная, ваенная, парламенцкая, судовая рэформы Жыгімонта Аўгуста). «Устава на валокі 1557 г.».

21. Адміністрацыйна-тэрытарарыяльны падзел Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага пасля рэформы.
22. Сістэма парэформенных мясцовых судоў. Састаў і юрысдыкцыя судоў гродскіх, земскіх і падкаморскіх.
23. Ваяводскія і павятовыя соймікі. Кампетэнцыя і дзейнасць.
24. Змена кампетэнцыі мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў ваяводствах і паветах пасля рэформы.
25. Міжнародныя прававыя дагаворы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага з Вялікім княствам Маскоўскім, з Тэўтонскім ордэнам, Вялікім княствам Цвярскім, Ноўгародскай феадальнай рэспублікай, Лівоніяй і інш.
26. Агульная характарыстыка і асноўныя этапы развіцця прававой сістэмы.
27. Асноўныя крыніцы права ў перыяд фарміравання Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Звычаёвае права і абмежаванне яго дзейнасці.
28. Граматы (прывілеі) - важнейшыя крыніцы права XV - пачатку XVI стст.
29. Агульназемскія прывілеі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага і іх гісторыка-прававы аналіз.
30. Абласныя прывілеі і іх характарыстыка.Валасныя граматы.Гарадскія граматы на магдэбургскае права.
31. Соймавыя пастановы. Пастановы павятовых соймікаў.
32. Статут (Судзебнік) вялікага князя Казіміра Ягайлавіча 1468 г.
33. Кадыфікацыя права ў XVI ст. Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1529 г. і яго значэнне.
34. Прававое замацаванне сістэмнай рэформы грамадскага і дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў Статуце 1566 г. Асноўныя палажэнні Статута 1566 г.
35. Праблема выкарыстання субсідыярных крыніц права: рымскага, нямецкага, кананічнага і інш. Міжнародныя дагаворы - важныя крыніцы права Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага XV - XVIII стст.
36. Працэс фарміравання важнейшых інстытутаў і галінаў феадальнага права ў XIV - XVI стст.
37. Асноўныя палажэнні галіновага права (канстытуцыйнага, грамадзянскага, адміністрацыйнага, вайсковага, зямельнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і інш.).
38. Станаўленне канстытуцыйнага заканадаўства ў XVI ст.
39. Злачынства і пакаранне. Змены ў крымінальным і крымінальна-працэсуальным праве ў XV - XVI стст.Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага права ў XV - XVI стст.

40. Характэрныя асаблівасці і тэндэнцыі ў развіцці апякунскага, шлюбна-сямейнага, залогавага, прыродаахоўчага права ў XVI ст. Воінскія ўставы. Фарміраванне воінскага права.

**Тэма 4. Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – канец XVIII ст.). Асаблівасці грамадскага, дзяржаўнага ладу і права**

1. Грамадскі лад Рэчы Паспалітай.
2. Прававы статус шляхецтва. Паланізацыя шляхты.
3. Канчатковае запрыгоньванне сялян, заканадаўчае афармленне. Прававое становішча гараджан.
4. Прававы статус прадстаўнікоў этнічных меншасцей.
5. Берасцейская царкоўная ўнія 1596 года і яс наступствы.
6. Дзяржаўна-прававое становішча Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў складзе Рэчы Паспалітай. Форма дзяржаўнага ўладкавання Рэчы Паспалітай ў XVII - XVIII стст.
7. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.
8. Вышэйшыя органы ўлады і кіравання Рэчы Паспалітай.
9. Кароль Рэчы Паспалітай, яго прававое становічша і паўнамоцтвы. «Генрыкавы артыкулы», «Пакта канвента».
10. Сойм Рэчы Паспалітай. Яго склад і парадак дзейнасці. Сенат Рэчы Паспалітай. Пасольская ізба.
11. Соймавыя пастановы.
12. Павятовыя соймікі, іх дзейнасць і пастановы.
13. Спробы правядзення рэформаў дзяржаўнага ладу ў сярэдзіне XVIII ст. Змены ў дзейнасці сойма і павятовых соймікаў. Утварэнне скарбавай і вайсковай камісій. Заснаванне адукацыйнай камісіі.
14. Пастаянная Рада і яе дэпартаменты.
15. Слуцкая і Барская канфедэрацыі. Прыняцце закона аб ураўненні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з каталікамі.
16. Арганізацыя войска.
17. Мясцовыя органы ўлады і кіравання. Службовыя асобы мясцовай адміністрацыі (ваявода, кашталян, судовы староста, цівун, павятовы маршалак, падкаморы, харужы, войскі, стольнік, падстолі, падчашы і інш.).
18. Кіраванне гарадамі і мястэчкамі ў сістэме органаў улады.
19. Галоўны Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, стварэнне, парадак фарміравання і дзейнасці, юрысдыкцыя.
20. Задворны суд манарха. Інстытут інстыгатара. Асэсарскі суд. Рэферэндарскі суд.
21. Соймавы суд: склад, юрысдыкцыя.
22. Суд Камісіі скарбовай Літоўскай, Скарбовы трыбунал.

23. Духоўны Трыбунал.
24. Надзвычайныя суды. Каптуровы суд. Канфедэрацкі суд.
25. Інстытут адвакатуры. Інстытут вознага і вознага-генерала. Папярэдняе следства («шкрутыніўм»).
26. Першы падзел Рэчы Паспалітай.
27. Заканадаўчая дзейнасць Чатырохгадовага сойма Рэчы Паспалітай. Новыя тэндэнцыі ў развіцці права.
28. Канстытуцыя («Закон аб урадзе») Рэчы Паспалітай 1791 года. Змены ў дзяржаўным ладзе і ў сістэме вышэйшых органаў улады. Утварэнне і склад «Аховы законаў» Рэчы Паспалітай. Вялікія камісіі: паліцыі, войска, скарбу, адукацыі.
29. Таргавіцкая канфедэрацыя і замежная інтэрвенныя. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Гродзснскі сойм і яго Канстытуцыя. Паўстаннс 1794 г. пад кіраўніцтвам А.Т. Касцюшкі. Органы паўстання. Паланецкі ўніверсал.
30. Трэці падзел Рэчы Паспалітай. Далучэнне Беларусі да Расійскай імпсрыі.
31. Прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Крыніцы права Рэчы Паспалітай.
32. Агульная характарыстыка Статута 1588 г. Змены ў канстытуцыйным, грамадзянскім, крымінальным, працэсуальным і іншых галінах права.
33. Кардынальныя правы 1768, 1775, 1791 гадоў. Заканадаўства Чатырохгадовага сойма.
34. Volumina legum. Праекты новых законаў.
35. Развіццё гарадскога права.
36. Міжнародныя дагаворы Рэчы Паспалітай з Швецыяй, Турцыяй, Расіяй і інш.

**Тэма 5. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. - 1917 г.). Асаблівасці грамадскага, дзяржаўнага ладу і права**

1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель ў складзе Расійскай імперыі.
2. Тыльзіцкі мірны дагавор 1807 г. і далучэнне да Расійскай імперыі Беластоцкай акругі. Праекты аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Вайна 1812 г.
3. Органы расійскага мясцовага кіравання на тэрыторыі Беларусь Генерал-губернатар, яго паўнамоцтвы. Губернатар і губернскае праўленне. Казённая палата і іншыя губернскія ўстановы. Павятовыя органы дзяржаўнага кіравання.
4. Губернскія і павятовыя дваранскія сходы як органы саслоўнага самакіравання.
5. Судовыя ўстановы ў беларускіх губернях і паветах.
6. Паўстанне 1831 гг. і яго вынікі.
7. Полацкі царкоўны сабор і ліквідацыя ўніяцкай царквы.

8. Права. Кадыфікацыя мясцовага права. Праект зводу законаў заходніх губерняў. Увядзенне ў дзеянне законаў Расійскай імперыі. Адмена дзеяння Статута 1588 г.
9. Асаблівасці правядзення расійскіх буржуазных рэформ на тэрыторыі Заходніх губернях.
10. Скасаванне прыгоннага права. Маніфест 19 лютага 1861 г. Агульнае Палажэнне аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці. Палажэнне аб губернях і павятовых установах па сялянскіх справах. Мясцовыя палажэнні. Паўстанне 1863–1864 гг. Асаблівасці правядзення сялянскай рэформы на тэрыторыі Заходніх губерняў. Прававое становішча сялян пасля рэформы.
11. Рэформа мясцовых органаў. Міравыя пасрэднікі. Сялянскія сходы. Валасное праўленне. Валасны суд.
12. Паліцэйская рэформа 1862 г., яе значэнне.
13. Земская рэформа і асаблівасці яе правядзення на тэрыторыі Заходніх губернях. Земскія сходы і іх управы.
14. Рэарганізацыя гарадскіх оранаў кіравання ў 1870 г. і 1892 г.
15. Ваенная і іншыя рэформы.
16. Контррэформы ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст.
17. Рэвалюцыйны і нацыянальны рух на тэрыторыі Заходніх губернях у пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. Маніфест 6 жніўя 1905 г. аб утварэнні Дзяржаўнай Думы, Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. аб удасканаленні дзяржаўнага парадку. Канстытуцыйны характар «Звода асноўных дзяржаўных законаў» (1906 г.). Дзяржаўны Савет і яго дзейнасць.
18. Сталыпінская аграрная рэформа.
19. Беларускія землі ў гады Першай сусветнай вайны. Акупацыя беларускіх зямель Германіяй.
20. Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. на тэрыторыі Беларусі.
21. Развіццё права ў канцы XIX – пачатку XX стст. Змены ў цывільным, крымінальным і працэсуальным праве. Крымінальнае ўлажэнне 1903 г.
22. Заканадаўства Расіі ваеннага часу (1914–1917 гг.).
23. Заканадаўства Часовага ўраду Расіі. Усталявання троеўладзя на тэрыторыі беларускіх губернях.

**Тэма 6. Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў перыяд рэвалюцыйных пераўтварэнняў і ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (1917-1922 гг.)**

1. Лютаўская рэвалюцыя ў Расійскай імперыі. Троеўладдзе ў Беларусі.
2. Актывізацыя беларускага нацыянальнага руху. З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25 - 27 сакавіка 1917 г. у Мінску. ІІ з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый.

3. Беларускі нацыянальны рух на тэрыторыі Беларусі, акупаванай Германіяй. Дзейнасць Віленскай беларускай рады.
4. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. Усталяванне Савецкай улады на неакупіраванай войскамі Германіі тэрыторыі Беларусі. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронта, яго Прэзідыум і Савет Народных Камісараў.
5. Усебеларускі з’езд (кангрэс) у Мінску ў снежні 1917 г. Рада Ўсебеларускага з’езда і яе выканаўчы камітэт.
6. Брэст-Літоўскі мірны дагавор і яго гісторыка-прававая характарыстыка.
7. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Устаўныя граматы. Першы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі (Народны Сакратарыят) і яго дзейнасць. Устаўныя граматы БНР і іх гісторыка-прававы аналіз.
8. Першы з’езд КП(б)Б і яго рашэнні.
9. Фарміраванне і склад першага Часовага рабоча-сялянскага ўрада ССРБ.
10. Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі аб стварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусіі ад 1 студзеня 1919 г.
11. Тэрыторыя ССРБ. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.
12. Першы з’езд Саветаў ССРБ і яго рашэнні.
13. Першая Канстытуцыя ССРБ 1919 г.
14. Ліквідацыя ССРБ і ўтварэнне Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (ЛітБел). Вышэйшыя і мясцовыя органы савецкай ўлады ЛітБел.
15. Другі з□езд Саветаў ССРБ (снежань 1920 г.). Прыняцце Дапаўненняў да Канстытуцыі ССРБ 1919 г.
16. Праваахоўныя органы ССРБ і прававое рэгуляванне іх дзейнасці.
17. Рыжскі мірны дагавор Польшчы з РСФСР і ССРУ 1921 г. Падзел тэрыторыі Беларусі.
18. Тэрыторыя, вышэйшыя і мясцовыя органы дзяржаўнай улады ССРБ. Узаемаадносіны РСФСР і ССРБ ў 1921–1922 гг.
19. Саюзны рабоча-сялянскі дагавор 1921 г.
